Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №5(68), 2011

*УДК [94(470:438)]:327(061.3)«1922»*

# Спробы польска-савецкага збліжэння напярэдадні Генуэзскай канферэнцыі 1922 г.

М. М. Мязга

В статье выявлено формирование тенденции к улучшению польско-советских отношений накануне Генуэзской конференции и определены причины, по которым эта тенденция не приобрела устойчивый характер.

**Ключевые слова:** Польша, РСФСР, международные отношения, Генуэзская конференция.

In the article the formation of tendencies for improvement of Polish-Soviet connections on the eve of Genoa conference has been discovered and the reasons why this tendency did not obtain stable character have been singled out.

**Keywords:** Poland, Russian Soviet Federative Socialist Republic, international connections, Genoa conference.

Польска-савецкія адносіны ў першыя гады пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора атрымалі параўнальна слабое адлюстраванне ў айчыннай і постсавецкай гістарыяграфіі ў цэлым. Работы, якія былі створаны па гэтай праблеме ў савецкі час, даволі аднабаковыя і тэндэнцыёзныя. Яны ідэалізуюць знешнюю палітыку Савецкай Расіі і ўсю віну за напружаны стан польска-савецкіх адносін у акрэслены перыяд ускладаюць выключна на правячыя колы ПОЛЬШЧЫ [1]. З другога боку, польскія сучасныя гісторыкі робяць акцэнт на міралюбчым характары палітыкі Польшчы пасля заключэння Рыжскага дагавора, не звяртаючы ўвагу на польскія дзеянні, звязныя з імкненнем да ўсталявання дамінавання ў рэгіёне Цэнтральна-Усходняй Еўропы, што не магло не выклікаць негатыўнай рэакцыі з боку Савецкай Расіі [2; 3]. У дадзеным артыкуле мы ставім задачу высветліць, якія фактары напярэдадні склікання Генуэзскай міжнароднай канферэнцыі прывялі да пацяплення ў польска-савецкіх адносінах і наколькі дадзеная тэндэнцыя аказалася ўстойлівай.

У самым канцы 1921 – пачатку 1922 г. назіраецца імкненне правячых колаў Польшчы дабіцца перамен да лепшага ў польска-савецкіх адносінах. Гэта было заўважана ў Маскве. 1 студзеня 1922 г. была апублікавана дэкларацыя IX Усерасійскага з’езда саветаў “Аб міжнародным становішчы РСФСР”. У ёй адзначалася ўзмацненне мірных тэндэнцый у польскіх урадавых і дзелавых колах [4, с. 120]. Для такіх заяў меліся падставы. Яшчэ 5 снежня 1921 г. Польшча звярнулася да савецкага ўрада з прапановай пачаць перамовы аб заключэнні гандлёвага дагавора [5, с. 131]. Пазітыўныя змены ў савецка-польскіх адносінах па часе супалі з падрыхтоўкай еўрапейскіх краін да Генуэзскай канферэнцыі.

Прынятае Антантай рашэнне аб скліканні канферэнцыі ў Генуі з удзелам Германіі і Савецкай Расіі выклікала пэўную заклапочанасць у польскіх палітычных колах. У той момант для польскага ўрада найбольш важным было пытанне ўстойлівасці граніц краіны. Не выключалася, што на канферэнцыі можа паўстаць дыскусія па пасляваенных дамовах, а Савецкая Расія ўздыме пытанне аб польска-савецкай мяжы, якая ў той час яшчэ не была прызнана міжнароднай супольнасцю [6, s. 39]. Для такіх апасенняў у палякаў былі падставы. У данясенні польскага пасольства ў Германіі ў Варшаву паведамлялася аб намеры савецкай дэлегацыі ў Генуі выступіць, прычым сумесна з Германіяй, за прыналежнасць Вільні Літве. Узгодненасць інтарэсаў РСФСР і Германіі па гэтаму пытанню тлумачылася іх агульнай зацікаўленасцю ў ажыццяўленні транзіта праз літоўскую тэрыторыю [7, ł. 13].

Польскаму ўраду прыходзілася лічыцца і з магчымасцю зваротаў да канферэнцыі прадстаўнікоў нацыянальных рухаў, у якіх ставілася б пад сумненне легітымнасць польскіх межаў. Літаральна напярэдадні канферэнцыі 22 сакавіка 1922 г. бюлетэнь беларускага прэсбюро ў Коўна паведамляў, што ўраду Галіцыйской Рэспублікі даслана паведамленне Сакра-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

тарыяту Лігі нацый. У ім паведамлялася, што адмысловы камітэт Лігі нацый разглядаў усходнегаліцыйскае пытанне і прыняў рашэнне адстойваць незалежнасць Галіцыйскай рэспублікі. Таксама паведамлялася аб публікацыях у англійскай прэсе, у якіх падвяргалася крытыцы імперыялістычная палітыка Польшчы, якая знайшла адлюстраванне ў захопе велізарнай прасторы на ўсходзе Еўропы [8, арк. 34]. Пытанне аб польскай усходняй мяжы спрабавалі рэгулярна ўздымаць і беларускія нацыянальныя арганізацыі. У гэтых умовах польскі ўрад А. Панікоўскага лічыў, што шлях да захавання незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы ляжыць перш за ўсё праз умацаванне саюза з Францыяй. Было прынята рашэнне аб паскарэнні падрыхтоўкі эканамічнай дамовы з ёй, пасля чаго павінна была ўступіць у сілу і саюзная дамова паміж дзвюма краінамі. Аднак спадзяванні дабіцца ад Францыі гарантый для польска-савецкай граніцы, усталяванай Рыжскім дагаворам, польская дыпламатыя да пачатку Генуэзскай канферэнцыі ажыццявіць не змагла. Візіт К. Скірмунта ў Парыж у пачатку красавіка з пункту гледжання вырашэння гэтага пытання аказаўся безвыніковым.

Польшча імкнулася таксама да ўсталявання саюзных адносін з краінамі Малой Антанты і Балтыі. Саюз з гэтымі дзяржавамі таксама павінен быў, па меркаванні правячых колаў Польшчы, умацаваць яе міжнародныя пазіцыі перад магчымымі пагрозамі. У лютым у Бухарэсце адбылася канферэнцыя краін Малой Антанты і Польшчы. Малая Антанта, перш за ўсё Чэхаславакія, не пайшла на саюз з Варшавай, асцерагаючыся быць уцягнутай у канфлікт з Расіяй [9, с. 29]. Выключэнне сярод краін Малой Антанты складала толькі Румынія, з якой яшчэ ў сакавіку 1921 г. Польшчай быў падпісаны ваенны саюз, закліканы забяспечыць непарушнасць польска-савецкай і румына-савецкай граніц [10, s. 148–149].

Што датычыцца краін Балтыі, то ідэя польска-балтыйскага саюза высоўвалася польскай дыпламатыяй яшчэ на Рыжскай канферэнцыі прадстаўнікоў Польшчы, Фінляндыі, Эстоніі і Латвіі, праходзіўшай летам 1920 г. Аднак ініцыятыва польскага ўрада была стрымана сустрэта прыбалтыйскімі дзяржавамі. Толькі на Варшаўскай канферэнцыі ў сакавіку 1922 г. Польшча змагла дамагчыся пэўнага поспеху ў ажыццяўленні сваіх планаў. 17 сакавіка Польшча, Фінляндыя, Эстонія і Латвія падпісалі тэрмінам на пяць гадоў дагавор, удзельнікі якога абавязаліся ўзаемна прызнаць мірныя дамовы з Савецкай Расіяй і цесна супрацоўнічаць пры правядзенні знешняй палітыкі. Артыкул 7 утрымоўваў замаскіраванае абавязацельства ўзаемадапамогі ўдзельнікаў дагавора ў выпадку агрэсіі супраць аднаго з іх. Удзельнікі дамовы павінны былі ў гэтым выпадку захоўваць у адносінах адзін да другога добразычлівы нейтралітэт і выпрацаваць сумесныя меры, якія неабходна прадпрыняць [11, с. 148]. Артыкул 7 быў накіраваны не толькі супраць Савецкай Расіі, але і супраць Германіі.

Характэрна, што савецкае кіраўніцтва таксама было зацікаўлена ва ўзгадненні пазіцый з прыбалтыйскімі дзяржавамі напярэдадні Генуі. Як бачна з тэлеграмы члена калегіі Наркамата Замежных Спраў (НКЗС) РСФСР Я. Ганецкага савецкаму паўпраду ў Варшаве Л. Абаленскому ад 3 сакавіка 1922 г., НКЗС спрабаваў ініцыяваць скліканне балтыйскай канферэнцыі ў Маскве [12, арк. 30]. Аднак прадстаўнікі прыбалтыйскіх дзяржаў сабраліся ў Варшаве і без удзелу РСФСР. Толькі 15 сакавіка ў Маскве было атрымана запрашэнне на гэтую канферэнцыю, але савецкі прадстаўнік на яе не прыбыў [1, с. 99]. Магчыма, польскі ўрад, пасылаючы запрашэнне Савецкай Расіі прыняць удзел у канферэнцыі ў Варшаве фактычна ўжо ў момант яе адкрыцця, і разлічваў на тое, што яна не дашле свайго прадстаўніка.

Варшаўскае пагадненне выклікала заклапочанасць у Маскве. Савецкая дыпламатыя імкнулася паставіць адносіны Польшчы з прыбалтыйскімі дзяржавамі пад свой кантроль і аслабіць антысавецкую скіраванасць Варшаўскага пагаднення ад 17 сакавіка. Польскі ўрад, са свайго боку, незадоўга да пачатку Генуэзскай канферэнцыі стаў выяўляць зацікаўленасць у паляпшэнні адносін з Расіяй. Польскае прадстаўніцтва ў Маскве атрымала інструкцыю Міністэрства замежных спраў (МЗС), у якой гаварылася аб пажаданасці ўзгадніць з Расіяй пазіцыі па праблемах, якія будуць абмяркоўвацца ў Генуі. Гэтая ініцыятыва знайшла станоўчы водгук савецкага ўрада. Было вырашана прыцягнуць да перамоў і прыбалтыйскія дзяржавы [13, s. 142]. Канферэнцыя адбылася 29–30 сакавіка ў Рызе з удзелам прадстаўнікоў РСФСР, Польшчы, Фінляндыі, Эстоніі і Латвіі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пытанні, звязаныя з будучай канферэнцыяй у Генуі, былі ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў нарады ў Рызе. Польшча згаджалася падтрымаць у Генуі савецкія намаганні, накіраваныя на дасягненне раўнапраўнага становішча Савецкай Расіі з іншымі дзяржавамі. Узамен палякі жадалі, каб Масква не падтрымлівала Літву ў яе канфлікце з Польшчай і актыўней выконвала шэраг умоў Рыжскага дагавора [14, s. 159]. Падпісаны па выніках нарады пратакол прадугледжваў супрацоўніцтва яе ўдзельнікаў у справе эканамічнага ўзнаўлення Еўропы, у рашэнні праблем раззбраення. Была дасягнута таксама дамоўленасць аб узгодненых дзеяннях у Генуі. У пратаколе гаварылася і аб пажаданасці юрыдычнага прызнання РСФСР вядучымі дзяржавамі Захаду [15, с. 146–148]. Падпісанне гэтага пратакола некалькі аслабіла антысавецкую скіраванасць Варшаўскага пагаднення ад 17 сакавіка. Удзельнікі Рыжскай канферэнцыі, падпісаўшы яе пратакол, выказаліся за каардынацыю сваіх дзеянняў у Генуі.

Згода польскага ўрада на сустрэчу ў Рызе сведчыць аб тым, што, рухаючыся ў цэлым у фарватары французскай знешняй палітыкі, ён напярэдадні Генуі гатовы быў пайсці на пэўнае паляпшэнне адносін з РСФСР. Міністр замежных спраў Польшчы на сустрэчы з журналістамі 31 сакавіка заявіў, што Варшаўскі дагавор не носіць антысавецкі характар, і Польшча зробіць усё магчымае, каб захаваць добрасуседскія адносіны з Савецкай Расіяй. Да гэтага яе падштурхоўвалі аб'ектыўныя інтэрасы дзяржавы. Варта адзначыць рост зацікаўленасці польскіх дзелавых колаў у развіцці эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй. Так, 23 лютага да прэм'ер-міністра звярнулася гандлёва-прамысловая палата Львова з заклікам тэрмінова прыступіць да гандлёвых перамоў з РСФСР і Савецкай Украінай. Аналагічны заклік быў накіраваны 8 лютага польскім політэхнічным таварыствам [5, с. 140].

На пазіцыю польскіх прамыслоўцаў, як і польскага ўрада, уплывала і інфармацыя аб праходзіўшых у пачатку 1922 г. савецка-германскіх перамовах. У студзені – лютым у Берліне знаходзіўся асноўны савецкі спецыяліст па Германіі К. Радек. Падчас перамоў з прадстаўнікамі германскага ўрада ён прапанаваў аднавіць дыпламатычныя адносіны паміж дзвюма краінамі яшчэ да пачатку Генуэзскай канферэнцыі і заняць на ёй узгодненую пазіцыю. Польскі ўрад уважліва сачыў за савецка-германскімі кантактамі. 22 студзеня 1922 г. польскае пасольства ў Берліне паведамляла ў Варшаву, што ў германскай сталіцы адбыліся перамовы паміж прадстаўнікамі Расіі і Германіі, падчас якіх савецкі бок прапанаваў рэарганізаваць германскае часавае прадстаўніцтва ў Маскве ў пасольства. Узамен было абвешчана аб гатовасці савецкага бока даць Германіі кампенсацыю за забойства Мірбаха [16, ł. 1]. У канцы снежня 1921 г. у Расію прыбыла група германскіх прамыслоўцаў з мэтай вывучэння магчымасцей эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі, а ў красавіку Маскву наведаў прадстаўнік вышэйшай эканамічнай рады Германіі О. Гуго. У склаўшайся сітуацыі палякі апасаліся, што немцы апярэдзяць іх у справе пранікнення на расійскі рынак.

Некатораму паляпшэнню савецка-польскіх адносін напярэдадні Генуі спрыяла і пэўная агульнасць палітычных інтэрасаў дзвюх краін. Прызнанне вядучымі дзяржавамі Захаду Савецкай Расіі павінна было прывесці і да прызнання імі Рыжскага дагавора, а, такім чынам, і ўсталяванай ім польска-савецкай граніцы. У заяве для друку 5 красавіка К. Скірмунт адзначыў, што Польшча не будзе перашкаджаць юрыдычнаму прызнанню РСФСР, бо гэта будзе спрыяць прызнанню ўсходняй польскай мяжы [17].

Урад РСФСР імкнуўся выкарыстаць зацікаўленасць Польшчы ў супрацоўніцтве з Расіяй у Генуі, каб аслабіць уплыў на яе Францыі. Аб гэтым прама гаварылася ў дакладзе савецкай дэлегацыі па выніках Генуэзскай канферэнцыі, дзе факт падпісання Рыжскага пратакола ад 30 сакавіка названы "пачаткам вызвалення Малой Еўропы з-пад уплыву Францыі" [18, с. 5]. Акрамя таго, дэманструючы збліжэнне з Польшчай, можна было аказаць націск на ГЕРМАНІЮ, якая да пачатку Генуэзскай канферэнцыі не жадала ісці на падпісанне дамовы з РСФСР.

Аднак польскі ўрад ужо праз некалькі дзён пад ціскам Францыі дэзавуіраваў подпіс свайго прадстаўніка пад Рыжскім пратаколам. Гэта было зроблена Панікоўскім у выступленні ў соймавай камісіі па замежных справах 6 красавіка, калі ён заявіў, што польскі прадстаўнік на нарадзе не меў паўнамоцтваў штосьці падпісваць [19, с. 47]. Пазней, выступаючы ў сойме па выніках Генуэзскай канферэнцыі, К. Скірмунт адзначаў, што польскае кіраўніцтва

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

разглядала Рыжскі пратакол як справаздачу аб абмене меркаваннямі дэлегатаў, і "польскі ўрад не адчуваў сябе звязаным гэтым пратаколам" [5, с. 156].

Нягледзячы на некаторае пацяпленне ў савецка-польскіх адносінах перад пачаткам Генуэзскай канферэнцыі, наўрад ці можна казаць аб тым, што ў Маскве разлічвалі на іх устойлівае паляпшэнне. Напрыклад, савецкае кіраўніцтва доўга не давала адказа на польскую прапанову аб пачатку гандлёвых перамоў. У выніку яны пачаліся толькі 10 сакавіка 1922 г., але вельмі хутка прыйшлі ў тупік. Ужо 4 красавіка савецкае прадстаўніцтва ў Варшаве паведамляла ў Маскву, што перамовы «селі на мель», а глава польскай дэлегацыі Страсбургер адʼязджае на конферэнцыю ў Геную [20, арк. 38]. На савецка-польскія адносіны пастаянна ўплываў германскі фактар. Масква ішла на паляпшэнне адносін з Польшчай, пастаянна аглядваючыся на Германію, апасаючыся, каб збліжэнне з Польшчай не пашкодзіла наладжванню савецка-германскага супрацоўніцтва. Так, згоду пачаць гандлёвыя перамовы з Польшчай савецкі ўрад выявіў толькі пасля таго, як 17 лютага 1922 г. былі безвынікова перарваны савецка-германскія перамовы. І ў той час, калі пачаліся польска-савецкія гандлёвыя перамовы, РСФСР не страчвала надзею дамовіцца з Германіяй. 2 красавіка па дарозе ў Геную ў Берлін прыбыла савецкая дэлегацыя на чале з наркамам замежных спраў Г.В. Чычэрыным. Савецкія кіруючыя колы разлічвалі, што пасля Рыжскай нарады і ва ўмовах пагаршэння ў той час польска-германскіх адносін, немцы стануць больш згаворлівымі і падпішуць праектуемую палітычную дамову. Збліжэнне з Польшчай для Масквы было толькі сродкам ціску на Германію. Польшча са свайго боку рабіла толькі некаторыя чыста тактычныя крокі для дэманстрацыі збліжэння з РСФСР, развіваючы ў першую чаргу саюзныя адносіны з Францыяй, якую Масква разглядала ў той момант як найбольш небяспечнага праціўніка на міжнароднай арэне.

Такім чынам, у сувязі з падрыхтоўкай Генуэзскай канферэнцыі ў пачатку 1922 г. выявілася пэўная агульнасць міжнароднапалітычных інтарэсаў Савецкай Расіі і Польшчы. Яна грунтавалася на тым, што жаданне РСФСР дабіцца міжнароднога прызнання з боку вялікіх дзяржаў Захаду адпавядала ў значнай ступені і інтарэсам Польшчы. Польскі ўрад разлічваў, што такім чынам будзе адкрыты шлях да міжнароднага прызнання польска-савецкай граніцы, усталяванай Рыжскім дагаворам. Другім фактарам, які спрыяў некатораму паляпшэнню польска-савецкіх адносін у той момант, была зацікаўленасць Польшчы ў эканамічным супрацоўніцтве з Савецкай Расіяй. Аднак гэтых фактараў аказалася недастаткова, каб тэндэнцыю да паляпшэння польска-савецкіх адносін напярэдадні Генуі зрабіць устойлівай. Працягвалі дзейнічаць шэраг фактараў, якія падрывалі яе. Да іх ліку трэба аднесці супярэчнасці паміж РСФСР і Польшчай у Прыбалтыцы. Імкненне палякаў усталяваць тут свой уплыў, заключэнне Варшаўскага пагаднення 17 сакавіка 1922 г. выклікала рэзка негатыўную рэакцыю савецкага ўрада. Адмоўна ўплываў на развіццё польска-савецкіх адносін германскі фактар. У тагачаснай міжнароднай сітуацыі Савецкай Расіі даводзілася рабіць выбар паміж добрымі адносінамі з Польшчай і з Германіяй. Гэты выбар быў на карысць Германіі, у якой з Расіяй у значна большай ступені супадалі ў той час міжнароднапалітычныя інтарэсы ва ўмовах Версальскай сістэмы еўрапейскіх адносін. Падпісанне Рапальскага дагавора канчаткова перакрэсліла тэндэнцыю пачатку 1922 г. да савецка-польскага збліжэння і парадзіла ў адносінах паміж Савецкай Расіяй і Польшчай глыбокі крызіс.

## Літаратура

1 Ольшанский, П.Н. Рижский договор и развитие польско-советских отношений 1921–1924 / П.Н. Ольшанский. – М.: Наука, 1974. – 258 с.

2 Garlicki, A. Utrzymanie pokoju i status quo – zasada polityki II Rzeczypospolitej / A. Garlicki // Rola i miejsce Polski w Europie 1914–1957. – Warszawa: PAN, 1994. – S. 81–90.

3 Tomaszewski, J. Polska w Europie i świecie 1918–1939 / J. Tomaszewski, Z. Landau. – Warszawa: Panst. Inst. Wyd., 2005. – 346 s.

4 Советский Союз в борьбе за мир. – М.: Госиздат, 1929. – 376 с.

5 Документы и материалы по истории советско-польских отношений: в 14 т. Т. 4. – М.: Наука, 1966. – 559 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

6 Mikulicz, S. Polityczne manewry polskiej dyplomacji przed konferencją w Genui. 1922 / S. Mikulicz // Studia z najnowszych dziejòw powszechnych. – 1963. – T. 3. – S. 31–45.

7 Depesza Ambasady RP w Berline w Ministerstwo Spraw Zagranicznych. 10.04.1922 // Archiwum Akt Nowych. Ministerstwo Spraw Zagranicznych. Sygn. 6629.

8 Бюлетэнь Беларускага прес-бюро ў Коўна. 22.03.1922 // Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 325. Воп. 1. Спр. 212.

9 Рубинштейн, Н. Внешняя политика советского государства в 1921–1925 годах / Н. Рубинштейн. – М.: Госполитиздат, 1953. – 92 с.

10 Dokumenty z dziejòw polskiej polityki zagranicznej 1918–1938: w 2 t. T. 1. – Warszawa: Inst. Wyd. Pax., 1989. – 540 s.

11 Материалы Генуэзской конференции. – М.: Издат. НКИД, 1922. – 372 с.

12 Тэлеграма члена Калегіі НКЗС РСФСР Я. Ганецкага паўпраду ў Варшаве Л. Абаленскаму. 3.03.1922 // Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі. – Фонд 04. Воп. 32. П. 211а. Спр. 134.

13 Kumaniecki, J. Polski aspect stosunkow radziecko-niemieckih w 1922 r. / J. Kumaniecki \\ Przeglad historyczny. – 1990. – T. LXXXI, zeszyt 1–2. – S. 139–150.

14 Mikulicz, S. Od Genui do Rapallo / S. Mikulicz. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1966. – 248 s.

15 Документы внешней политики СССР: в 22 т. Т. 5. – М.: Госполитиздат, 1963. – 807 с.

16 Depesza Ambasady RP w Berline w Ministerstwo Spraw Zagranicznych. 22.01.1922 // Archiwum Akt Nowych. Ministerstwo Spraw Zagranicznych. Sygn. 6629.

17 Известия. 9 апреля 1922 г. № 80.

18 Иоффе, А.А. От Генуи до Гааги. Сборник статей / А.А. Иоффе. – М.: Госиздат, 1923. – 43 с.

19 Почс, К.Я. «Санитарный коридор»: Прибалтийский регион и Польша в антисоветских планах английского и французского империализма (1921–1929 годы) / К.Я. Почс. – Рига: Изд. Зинатне, 1985. – 176 с.

20 Тэлеграма паўпрада РСФСР у Варшаве Л. Абаленскага ў Народны Камісарыят Замежных Спраў РСФСР. 4.04.1922 г. // Архіў Знешняй Палітыкі Расійскай Федэрацыі. – Фонд 04. Воп. 32. П. 211а. Спр. 133.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ